**ДЗЯМЕ́ЦКІ** Анатоль Мар'янавіч (н. 15.10.1921, в. Юркаўцы Вінніцкай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне хірургіі і тапаграфічнай анатоміі. Д-р мед. н. (1970), праф. (1971). Скончыў Харкаўскі мед. ін-т (1952). З 1953 у Віцебскім мед. ін-це. Навук. працы па даследаванні стану артэрый пры вострай прамянёвай хваробе і стану вен пры аперацыях на артэрыях; па метадах рэаграфіі для дыферэнцыяльнай дыягностыкі сасудзістых пашкоджанняў ніжніх канечнасцей, выкарыстанні магнітных палёў у медыцыне.

*Тв.:* Магнитные поля в здравоохранении. Самара, 1991 (разам з Б.Н.Жукавым і А.У.Цацоха); Лечение термических ожогов. Ростов н/Д, 1992 (у сааўт.).